# “Ды не высоўвайся ты!”, або А мазалёў ад вуды яшчэ няма?..

Тэндэнцыі плюс аналітыка: ад маркетынгавай ідэі да рэальнага ўвасаблення

Кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў споўнілася днямі 20 гадоў. З гэтай нагоды ў бібліятэчнай канферэнц-зале ўстановы прайшоў “круглы стол” з удзелам кіраўнікоў, выкладчыкаў, студэнтаў і выпускнікоў згаданай кафедры, а таксама журналістаў “Культуры”.

Памятаеце надзённую на сёння показку пра тое, што галоднаму не рыбу трэба даць, а вуду, каб ён не залежыў ад абставін, а сам будаваў свой лёс? Калі прымяніць тую прымаўку да канкрэтнай сітуацыі, дык сацыякультурны менеджмент якраз і будзе для работнікаў культуры “лёсавызначальнай” вудай. І як практыка паказвае, ёю з ахвотай ды аддачай карыстаюцца. Толькі збольшага — не ў дзяржаўнай сферы сельскай культуры. Дык чаму ж няма пакуль мазалёў ад “менеджменцкай” “вуды” ў сельскіх клубнікаў і бібліятэкараў? У тым ліку і пра гэта ішла гаворка за “круглым сталом”.

**Аляксандр СЦЕПАНЦОЎ, загадчык кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ:**

— За дваццаць гадоў назапашана шмат станоўчага ў падрыхтоўцы кадраў, але і праблем у кафедры хапае. Таму мы і сабраліся, каб абмяняцца думкамі, выказаць прапановы.



**Мікалай КАРАЛЁЎ, дэкан факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— Яшчэ шэсць гадоў таму прапаноўвалі ўнесці змяненні ў пералік пасад кіраўнікоў у сферы культуры. Нічога не змянілася. У аналагічным класіфікатары Міністэрства адукацыі закладзены пасады менеджараў сацыяльнай сферы, міжнародных культурных сувязей, арганізатараў сацыякультурнай дзейнасці турыстычных арганізацый і гэтак далей. Пералік пасад, зацверджаны Міністэрствам культуры, застаецца нязменным цягам дзясяткаў гадоў. Натуральна, там і гаворкі няма пра сацыёлагаў, маркетолагаў, спецыялістаў па інфарматызацыі, піяры, фандрайзінгу, прадзюсараў... Вось і атрымліваецца, што наш выпускнік прыходзіць на працу з дыпломам, дзе пазначана, што ён, скажам, менеджар, а ва ўстановах культуры, якія фінансуюцца з бюджэту, яму даводзіцца займацца зусім іншым…



**Яўген РАГІН, рэдактар аддзела газеты “Культура”:**

— Таму, напэўна, і ідуць выпускнікі ў прыватныя рэкламныя ці турыстычныя агенцтвы: там і заробак невымерна большы, і магчымасці для самарэалізацыі — іншыя...

**Мікалай КАРАЛЁЎ:**

— Так, стары штатны расклад проста звязвае нашым спецыялістам рукі. І гэта прытым, што мы цяпер распачынаем паглыбленую падрыхтоўку па спецыяльнасці вышэйшай адукацыі другой ступені “Арт-менеджмент” з прысваеннем ступені магістра менеджменту... Не, “вуду” выпускнікам мы далі, веды свае яны імкнуцца выкарыстаць напоўніцу, але нарматыўныя акты, пэўныя фінансавыя аспекты, мякка кажучы, звужаюць прасторы гэтай дзейнасці…

**Ірына СМАРГОВІЧ, дацэнт кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ:**

— Тут прысутнічае выпускніца кафедры, якая сутыкнулася з названай праблемай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



**Ірына ЯГОЎДЗІК, дырэктар Цэнтра культуры “Гродна”:**

— У снежні мінулага года ў Гродне пасля рэарганізацыі гарадскога метадычнага і культурна-забаўляльнага цэнтраў быў створаны Цэнтр культуры, які я ўзначаліла. Тады паўстала пытанне: якіх спецыялістаў набіраць? Запрашала спецыялістаў з іншых устаноў культуры. У аддзел міжнародных камунікацый, да прыкладу, быў патрэбны навуковы супрацоўнік, адзінка якога ў клубных установах не прадугледжана, як і адзінка экскурсаводаў. Няма менеджараў — мы іх замяняем метадыстамі. Узаемазамяняльныя пасады знайсці можна, а вось заробкі людзям павялічыць — нельга. Вы ведаеце, што клубныя ўстановы праходзяць цяпер па самай нізкай тарыфнай сетцы. Сітуацыю проста неабходна кардынальным чынам змяняць. Я як дырэктар Цэнтра не магу дазволіць, каб учарашні выпускнік БДУКіМ атрымліваў у нас 1 мільён 500 тысяч рублёў…



**Ірына СМАРГОВІЧ:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— Дык у чым вы бачыце выйсце?

**Ірына ЯГОЎДЗІК:**

— Трэба з дапамогай Міністэрства культуры неадкладна ўдасканальваць штатны расклад ці класіфікатар пасад.

**Яўген РАГІН:**

— А на мясцовым узроўні гэта зрабіць немагчыма?

**Ірына ЯГОЎДЗІК:**

— Мы ў гарвыканкаме і зацвердзілі сённяшні штатны расклад сваёй установы змяшанага клубнага тыпу. Увялі пасады перакладчыка, экскурсавода, навуковага супрацоўніка.

**Яўген РАГІН:**

— За кошт пазабюджэту?

**Ірына ЯГОЎДЗІК:**

— Не, за кошт бюджэту, але рашэнне прынята на ўзроўні мясцовай улады. Не ведаю, што праз год скажа фінансавая праверка…

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— Яшчэ адно пытанне — арганізацыя практыкі нашых студэнтаў. У мінскім культурным асяродку — і дзяржаўным, і прыватным — менеджараў хапае. Але ж і мы, і работнікі культуры рэгіёнаў хочам, каб у студэнтаў была выязная практыка. На вялікі жаль, у нас для гэтага няма пакуль заканадаўчай базы для студэнтаў-платнікаў. Педагагічная практыка аплачваецца. А наша выязная вытворчая і вучэбная, звязаная з выплатай камандзіровачных, аплатай пражывання, — не.

**Яўген РАГІН:**

— Між тым, рэгіёны, наколькі ведаю, зацікаўлены ў спецыялістах, нават калі гэта студэнты-практыканты.

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— Хоць і няма ў штатных раскладах менеджараў, але ў рэгіёнах яны — запатрабаваныя.

**Мікалай КАРАЛЁЎ:**

— І тут вось яшчэ які нюанс. У штатных раскладах менеджар адсутнічае, у класіфікатары Міністэрства культуры згадка пра яго ёсць, але ёсць і абмежаванне: чалавек можа займаць гэтую пасаду толькі з двухгадовым стажам. Нонсэнс. Выпускнік атрымлівае дыплом з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

класіфікацыяй менеджара, а ў пасадзе яму адмаўляюць, бо павінен адпрацаваць. А дзе? Адпрацаваць два гады ў прыватных структурах і прынесці даведку аб гэтым у дзяржаўную ўстанову?

**Яўген РАГІН:**

— Лягчэй у прыватных структурах і застацца. Так, напэўна, збольшага і адбываецца…

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— Хачу прадоўжыць гаворку аб практыцы. Праблему мы часткова вырашаем вельмі простым спосабам: даём накіраванні студэнтам па запытах з месцаў іхняга пражывання, у палацы і дамы культуры. Ці — у раёны пад Мінскам. Маю на ўвазе вучэбную практыку другакурснікаў, вытворчую — студэнтаў трэцяга курса і пераддыпломную — чацвёртага. Але гэтыя практыкі, на жаль, — невялікія…

**Мікалай КАРАЛЁЎ:**

— І яшчэ адна рэпліка. Гаворка — пра баланс гадзін паміж практыкай і аўдыторным навучаннем. Гэты баланс мы цяпер і шукаем. І першае як паветра патрэбна, і другое…

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— У нас сёння прысутнічаюць не толькі выпускнікі, але і студэнты, якія займаюцца пошукам і рэалізацыяй інавацыйных прадпрымальніцкіх ідэй, скіраваных на развіццё культуры. Хацелася б паслухаць нашага выпускніка Паўла Сапоцьку. Ён родам з Маладзечна. Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў нашай кафедры Павел распрацаваў свой праект турыстычнага кластара, вельмі запатрабаванай на сёння формы дзейнасці, — сімбіёзу прадпрымальніцтва і культуры.

**Павел САПОЦЬКА, студэнт чацвёртага курса:**

— Кластары — распаўсюджаная практыка ў заходнееўрапейскіх краінах. Адпаведныя ініцыятывы пачалі з’яўляцца і ў Беларусі, і не толькі ў прамысловасці. Гэта кансалідацыя зацікаўленых бакоў пры рэалізацыі сумеснага інавацыйнага творчага прадукту. Мы ўзялі сферу аграэкатурызму. Такія кластары створаны ў вёсцы Камарова Мядзельскага раёна. Тут была ўзята мадэль Літвы. Уласна кажучы, літоўскія спецыялісты першапачаткова і дапамагалі ствараць у Камарове кластары. Гэта эфектыўная ўзаемавыгадная форма дзяржаўна-прыватнага партнёрства. У нас дзяржава выконвае кансультацыйную функцыю, а прадпрымальнікі — ініцыятары справы. У Камарове ж ініцыятар — Цэнтр развіцця сельскага прадпрымальніцтва. Работнікі культуры ўключаюцца ў працэс. Удзельнікамі могуць быць і грамадскія суполкі, да прыкладу, — Беларускае грамадскае аб’яднанне “Адпачынак у вёсцы”. Праўда, заканадаўчай базы для ўзаемадзеяння няма....

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



**Яўген РАГІН:**

— Кластар — кааперацыя бакоў на роўных умовах? З прыватнікамі ўсё зразумела: яны — ініцыятары. А які тут унёсак аддзелаў культуры? Думаецца, яны пакуль — і на вялікі жаль! — далёка не на роўных умовах з бізнесменамі. І цягам апошніх гадоў сітуацыя ніякім чынам не змяняецца. А ў ідэале, як перакананa старшыня таго ж Праўлення БГА "Адпачынак у вёсцы" Валерыя Кліцунова, у раёне павінна існаваць ініцыятыўная група па развіцці кластарных праектаў, дзе на роўных умовах і прыватнікі, і аддзел культуры павінны развіваць мясцовую эканоміку... Іншая справа, што ідэал гэты — пакуль недасяжны... Аддзел культуры тут павінен не адставаць, а менавіта задаваць тон: у экскурсійным забеспячэнні "зялёных маршрутаў", канцэртна-тэатральным абслугоўванні турыстаў...

**Ірына ФАШЧЫЛІНА, у мінулым — старшы выкладчык кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ, аўтар творчага праекта "Тэатр рускага раманса":**

— Стасункаў з кафедрай не перарывала. І студэнты пад час практыкі бралі ўдзел у маім праекце. Калісьці выкладала менавіта праектаванне і развіццё сацыякультурнай сферы на рэгіянальным узроўні. І я хачу спыніцца цяпер на самых, як падаецца, балючых праблемах. Названы мной прадмет выкладаецца на апошнім курсе. Інакш кажучы, студэнты занадта позна пачынаюць вывучаць дыферэнцыяваныя падыходы да творчага праектавання. А гэтыя тэхналогіі варта вывучаць не павярхоўна, а глыбока. Без такой методыкі і гаворкі няма пра перспектыўнае мысленне. Памятаю, што другакурснікі так і не маглі мне адказаць на пытанне, што ж канкрэтна яны мяркуюць развіваць і які прадукт плануюць прасоўваць на пасадах работнікаў культуры…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



**Яўген РАГІН:**

— Значыць, гэтым займацца трэба ці не з першага курса?

**Ірына ФАШЧЫЛІНА:**

— Пра тое і гаворка! Веды павінны быць практыкаарыентаванымі. Камерцыйныя захады без эканамічнага багажу не маюць належнага эфекту. Вось пра гэта нам і варта сёння задумацца, інакш праекты па прасоўванні культурнага прадукту будуць у нашых выпускнікоў неканкурэнтаздольнымі.

**Яўген РАГІН:**

— Я для сябе сітуацыю з вашымі выпускнікамі зразумеў так. Вось, да прыкладу, жыццёвы выпадак, пра які мы пісалі. У вёску прыязджае прыватнік, прывозіць атракцыёны, фаер-шоу і за паўдня зарабляе мільёны, пакідаючы мясцовы СДК без пазабюджэту... Дык вось, клубам, умоўна кажучы, кіруюць вашы троечнікі, а той прыватнік — з ліку кафедральных выдатнікаў...

**Ірына ФАШЧЫЛІНА:**

— І зарабляе ён на далейшае развіццё свайго творчага праекта…

**Яўген РАГІН:**

— А выснова тут адна: троечнікаў трэба падцягваць да ўзроўню выдатнікаў, а выдатнікам стварыць усе ўмовы, каб яны заставаліся ў рэгіянальнай культуры, а не імкнуліся ў прыватны бізнес.

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— Мы не кажам цяпер пра тое, што культура цалкам павінна пераходзіць на рэйкі камерцыялізацыі. Але магчымасці кластарнага, да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкладу, узаемадзеяння павінны ўскалыхнуць бюджэтную культуру.

**Любоў СІВУРАВА, дацэнт кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ, кіраўнік фольк-гурта "Гуда":**

— Хачу дадаць, што згаданая вамі канкурэнцыя — здаровая. І калі наш гурт запрашае базавая ўстанова культуры, значыць, няма ў яе пакуль магчымасці прапанаваць адпаведны прадукт. Яшчэ адзін доказ, што рэклама, маркетынг робяць сваю дадатную справу. Няхай іншыя прапаноўваюць свае паслугі.



**Яўген РАГІН:**

— Аднак, відаць, час наспеў не пра канкурэнцыю казаць, а пра кааперацыю? Мне вельмі не падабаецца, калі аддзел культуры ідзе да гаспадара аграсядзібы, як прыгонны да пана…

**Любоў СІВУРАВА:**

— Значыць, спіць той начальнік аддзела! А прыватнікі не спяць… Хто рана ўстае, таму Бог дае.

**Яўген РАГІН:**

— З гэтага вынікае, што вы павінны выхоўваць у сваіх студэнтаў учэпістасць у добрым сэнсе слова. Учэпістасць — і творчую, і гаспадарчую. Культура на рэйкі камерцыялізацыі не пераводзіцца, але яна развіваецца цяпер у атачэнні менавіта рынкавых узаемаадносін.

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— Давайце такую сітуацыю разгледзім. Вось Павел Сапоцька як кіраўнік кластара (прыватная структура) звяртаецца да кіраўніка ЦК "Гродна" (структура дзяржаўная) Ірыны Ягоўдзік. Якія паслугі, Ірына

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Віктараўна, мы можаце прапанаваць наведвальнікам кластара?

**Ірына ЯГОЎДЗІК:**

— Майстар-класы ўмельцаў народных промыслаў. Уласна кажучы, мы такія паслугі і аказваем — яны карыстаюцца ў аграсядзібах вялікай папулярнасцю. Гэта кавальства, ганчарства, саломкапляценне, нацыянальная кухня…

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— І, напэўна, абрады, паслугі па арганізацыі святаў…

**Яўген РАГІН:**

— І колькі ЦК "Гродна" на гэтым зарабляе?

**Ірына ЯГОЎДЗІК:**

— Усяго толькі месяц як аказваем названыя паслугі. Але зазначу, што на Гродзеншчыне ганчарнае ды кавальскае мастацтва вельмі развітыя. Каля пятнаццаці майстроў-прафесіяналаў прыйшлі да нас і прапанавалі супрацоўніцтва… Дык вось, скаваць падкоўку для турыста мінімальна каштуе 28 тысяч рублёў за гадзіну. А каб завяршыць працу, патрэбна гадзіны чатыры…

**Яўген РАГІН:**

— І на якой канкрэтна аграсядзібе прапаноўваеце такую раскошу?

**Ірына ЯГОЎДЗІК:**

— У Каробчыцах. Там сёлета будзе праводзіцца Другі Пленэр разьбяроў па дрэве. Плануецца і кавальскае свята. Сферы культуры аддалі некалькі будынкаў вайсковай часткі. Уладкоўваем кузню, месца знойдзецца для керамістаў і разьбяроў па дрэве. А моладзь ад 19 да 25 гадоў сёння вельмі цікавіцца нацыянальнымі рамёствамі.

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— Наконт моладзі… СМІ нядаўна паведамілі, што да 2020 года шэраг прамысловых прадпрыемстваў сталіцы будзе вынесены за гарадскую мяжу. Памяшканні застануцца. Чаму б не выкарыстаць іх пад творчыя кластары? Моладдзю, якая ігнаруе сёння ведамасныя дамы культуры, такія кластары будуць запатрабаваныя. Бо ён — гэта і творчыя майстэрні, і галерэйная прастора, і кавярні з барамі. Гаворка — не пра новы тып Дома культуры, а пра новую дасугавую ўстанову, куды пойдуць на цэлы дзень людзі самых розных узростаў. І не проста пойдуць, а яшчэ і грошы свае прынясуць… Словам, не толькі раёны, але і горад адчувае патрэбу ў развіцці кластарных, праектных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Яўген РАГІН:**

— Шкада, што ў маёй сталічнай “Малінаўцы” няма прамысловых прадпрыемстваў, бо з устаноў культуры — толькі кінатэатр “Бярэсце”…

**Энгельс ДАРАШЭВІЧ, прафесар кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ:**

— Народная творчасць і фальклор таксама павінны прыносіць дывідэнды ў рэалізацыі праектных тэхналогій. Беларускі аўтэнтычны фальклор на сяле — не толькі крыніца духоўнасці, але і сур’ёзная падстава для рэалізацыі канкрэтных фінансавых праектаў. Таму даўно наспела неабходнасць пэўнай узгодненасці паміж нашымі кафедрамі. Нашы аўтэнтычныя гурты на сёння, карыстаючыся вашай тэрміналогіяй, — абсалютна нераскручаныя. А Еўропа імі цікавіцца. Таму вельмі разлічваю на вашу падтрымку.



**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— Цалкам згодная: праекты тут могуць быць вельмі цікавымі і эканамічна выгаднымі.

**Таццяна КАРНАЖЫЦКАЯ, дацэнт кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ:**

— Я пастараюся аб’яднаць негатыў з пазітывам. Урэшце, у культуры Беларусі адбываецца шмат цікавага, інавацыйнага. Калі мы кажам пра неабходнасць інтэграцыі, дык навуку ўзаемадзеяння выкладаць трэба як мага раней. Вы ведаеце пра бізнес-інкубатары — гэтая сістэма дазваляе студэнтам пад кіраўніцтвам практыкаў дасягнуць неблагіх эканамічных вынікаў ад рэалізацыі асабістых творчых праектаў. Універсітэту культуры такая структура патрэбна як паветра. А ўявіце, што наш бізнес-інкубатар будзе інтэграваны ў аналагічныя структуры іншых ВНУ. Чаму б нашым студэнтам ужо цяпер не рабіць інтэграваныя праекты? З тэхнічнага ўніверсітэта ўзяць у каманду праграміста, з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічнага — эканаміста... І дыпломная работа ў такім выпадку будзе інтэграваная. Такая аб’яднаная каманда можа займацца праектаваннем і зарабляннем грошай з першага курса. Распрацаваць праект і сумесна рэалізаваць яго ці на сяле, ці ў горадзе — гэтая ідэя выклікае ў студэнтаў вялікі інтарэс... Будучыня — за інтэграцыйнымі формамі адукацыі.

**Яўген РАГІН:**

— А калі б інтэграваная, але ўжо сямейная каманда (у складзе якой — розныя спецыялісты) закінутую вёску ва ўласнае карыстанне выкупіла?..

**Таццяна КАРНАЖЫЦКАЯ:**

— …За грошы, якія яна зарабіла на першым, другім курсах.

**Святлана ПАЦЫЕНКА, дацэнт кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ:**

— Некалькі гадоў выкладаю спецкурс, які называецца “Турысцкая анімацыя”. У студэнтаў ён выклікае велізарную цікавасць. Гэта тэхналогія ўцягнення ўдзельнікаў у творчы працэс. Ёсць экскурсійная анімацыя. Людзі не толькі “спажываюць” інфармацыю — яны становяцца часткай дзеі. Тое ж самае адбываецца і пры музейнай анімацыі. Ёсць тэхналогіі ажыўлення горада. І можна прадаваць такі прадукт. А новае і цікавае прыцягвае студэнтаў... Без анімацыі цяпер і на сяле не абысціся. Дарэчы, у 2011 годзе работнікі культуры Лепельскага раёна рэалізавалі маладзёжны інавацыйны праект “Домік у вёсцы”. У закінутай вёсцы пяці маладым гарадскім сем’ям была прадастаўлена магчымасць “выжыць” цягам некалькіх дзён. Карацей, для моладзі было створана адмысловае нестандартнае свята.



**Кацярына ЛАПІКАВА, выпускніца кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ, праектны менеджар,**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**выкладчык Інстытута культуры Беларусі:**

— У ІКБ на кафедры культуралогіі выкладаю праектны менеджмент не ў студэнтаў-пачаткоўцаў, а ў практыкаў. Натуральна, ёсць патрэба ў новых формах працы. А за праектаваннем, у тым ліку этнакультурным, — будучыня.



**Яўген РАГІН:**

— Скажыце, а чаму так мала цікавых творчых праектаў у нашых рэгіёнах, у тым ліку і этнакультурных? Літва з поспехам зарабляе на фальклоры, а мы — толькі збіраемся. Ды і ўвогуле любых творчых праектаў у раёнах — недаравальна мала.

**Кацярына ЛАПІКАВА:**

— Згодная, працэс толькі распачынаецца. Мы на курсе разам з кіраўнікамі ўстаноў культуры, метадыстамі метадычных цэнтраў займаемся праектаваннем, разлічваем іх рэнтабельнасць. І гэтыя праекты пачынаюць дзейнічаць.

**Яўген РАГІН:**

— А прывядзіце, калі ласка, прыклады. Куды мне ехаць у наступную журналісцкую камандзіроўку, каб убачыць і паказаць станоўчы праектны вопыт?

**Кацярына ЛАПІКАВА:**

— Можаце з’ездзіць у Веткаўскі музей...

**Яўген РАГІН:**

— Мы і так адтуль не вылазім практычна…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Кацярына ЛАПІКАВА:**

— Заўжды цікава ў начальніка аддзела культуры з Любані Васіля Каткаўца.

**Яўген РАГІН:**

— Таксама пра іх пастаянна пішам. Дзе новыя адрасы? Дзе цікавыя акцыі ўчарашніх студэнтаў кафедры? Няўжо усе яны пераважна — у прыватных структурах? А практыкі са стажам у дваццаць гадоў: дзе прыклады іхняй самарэалізацыі?

**Ірына СМАРГОВІЧ:**

— Справа — у кадрах. Пэўныя з іх не бяруцца за рэалізацыю нават капеечных па фінансаванні праектаў. Тлумачэнні тут простыя: лянотна, няма калі, начальнік аддзела за гэта не пахваліць...

**Энгельс ДАРАШЭВІЧ:**

— Фестываль "Берагіня" — гэта праект, што даўно выйшаў па значнасці за межы Акцябрскага раёна…

**Яўген РАГІН:**

— Згодны. Як, дарэчы, і з тым, што любы праектант павінен давесці мясцоваму кіраўніцтву, што без ягонага праекта раён не будзе мець належных маральных ці эканамічных дывідэндаў.

**Ірына ЯГОЎДЗІК:**

— Каб зацвердзіць штатны расклад сваёй установы, я бадай тыдзень не выходзіла з гарвыканкамаўскіх кабінетаў нашых фінансістаў…

**Яўген РАГІН:**

— А чаму на ўзроўні кафедры студэнты не атрымліваюць практычных навыкаў пераконваць патэнцыйных партнёраў у вялікай сацыяльнай значнасці любога заходу работніка культуры?

**Ірына ЯГОЎДЗІК:**

— Ну, гэта, хутчэй, якасці чалавечыя...

**Аляксандр СЦЕПАНЦОЎ:**

— Так, праяў яркай праектнай дзейнасці мала, але яны ёсць. І заслуга ў гэтым — менавіта нашых выпускнікоў. І ў большасці сваёй яны знаходзяць агульную мову з мясцовым кіраўніцтвам... Але, мяркуючы па прызнаннях завочнікаў, нярэдкія і такія жыццёвыя сітуацыі, калі на ініцыятыву ўчарашняга выпускніка дырэктар клуба кажа: "Ды не высоўвайся ты, дай мне да пенсіі дапрацаваць!" Прыкладаў такіх шмат.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І як паўплываць на сітуацыю, я пакуль, шчыра кажучы, проста не ведаю…

**Яўген РАГІН:**

— Усё, на маю думку, тлумачыцца вельмі проста. Сфера культуры на вачах старэе і ўспрымае інавацыі маладых як перашкоду асабістага бясхмарнага перадпенсійнага жыцця. Вось моладзь і сыходзіць пасля адпрацоўкі размеркавання ў сферу прыватнай самарэалізацыі... Усе агучаныя сёння праблемы вельмі хвалююць аддзел рэгіянальнай культуры нашай газеты. Ад вырашэння іх, на мой погляд, залежыць будучыня не толькі сельскай культуры, але і беларускага сяла ўвогуле. Інакш кажучы, да пытання сельскай прапіскі сацыякультурнага менеджменту, эфектыўнага творчага праектавання мы будзем звяртацца пастаянна.

**Фота Юрыя ІВАНОВА**

Аўтар: Яўген РАГІН
рэдактар аддзела газеты "Культура"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ